# Сёння споўнілася 120 гадоў з дня заснавання МГТС

Сёння, 14 лістапада 120 гадоў з дня заснавання «Мінскай гарадской тэлефоннай сеткі" (МГТС) - аднаго з філіялаў нацыянальнага аператара электрасувязі, інтэрнэт-вядучага правайдэра ў краіне - РУП "Белтэлекам".
14 лістапада 1896 года ў строй была ўведзена тэлефонная станцыя сістэмы Эрыксан на 100 нумароў. Яна была змантаваная ў будынку паштова-тэлеграфнай канторы па вул. Губернатарскай (цяпер вул.Леніна) у прыгожым 4-хпавярховым будынку.
Гэты дзень і з'яўляецца днём нараджэння «Мінскай гарадской тэлефоннай сеткі».
У юбілейную дату Міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей Папкоў павіншаваў калектыў і ветэранаў філіяла «Мінскай гарадской тэлефоннай сеткі».
«Гэта ўнікальная дата падкрэслівае багатую і насычаную гісторыю Мінскай гарадской тэлефоннай сеткі, гэта цэлая эпоха, некалькі пакаленняў людзей, якія прысвяцілі сваё жыццё прафесіі сувязіста. Ужо больш за стагоддзе падзяляюць нас з датаю першага тэлефоннага званка - за гэты час тэхналогіі ступілі далёка наперад і працягваюць імкліва развівацца. Мінская ГТС прайшла шлях развіцця ад камутатара на сто нумароў да поўнай цыфравізацыі ўсіх гарадскіх АТС і будаўніцтва сетак новага пакалення.
Сёння філіял уносіць значны ўклад у забеспячэнне бесперабойнай дзейнасці ўсіх сфер жыцця сталіцы і мае важную ролю ў жыцці беларускай сталіцы, забяспечваючы якаснай і надзейнай сувяззю мінчан і гасцей горада Мінска, без якой немагчыма ўявіць сучаснае, насычанае інфармацыяй жыццё такога мегаполіса, як Мінск.
Высокі прафесіяналізм і ўнікальны вопыт калектыву дазваляюць вырашаць самыя складаныя тэхналагічныя задачы, ісці ў нагу з часам, выкарыстоўваць найноўшыя дасягненні навукі і тэхнікі.
Глыбокай павагі і ўдзячнасці заслугоўваюць нашы ветэраны-сувязісты, працоўныя сямейныя дынастыі, якія сваёй добрасумленнай працай з году ў год будавалі, аднаўлялі, і ўдасканальвалі сучасную сістэму тэлефоннай сувязі ў горадзе Мінску.
Хай назапашаны патэнцыял стане трывалым падмуркам для ўстойлівага развіцця бізнесу і дазволіць ўвасобіць у жыццё самыя амбіцыйныя планы.
Жадаю далейшага эканамічнага ўздыму і фінансавага дабрабыту, калектыву -. Новых працоўных дасягненняў, поспехаў у справах і пачынаннях "

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/14-11-2016-1300*